**Т.І. Доўнар**

# ДА ПРАБЛЕМЫ ЎТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Складаны працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі заўсёды вызываў цікавасць шматлікіх даследчыкаў, аднак вывучаўся ён у мінулыя дзесяцігоддзі па загадзя вызначанай ідэалагічнай схеме і ў асноўным адносна ўтварэння дзяржаўнасці савецкага тыпу. Увогуле дзяржаўна-прававая гісторыя вывучалася павярхоўна і адвольна, некаторыя праблемы не аналізаваліся, а гістарычныя падзеі асвятляліся аднабакова. Тыя ж факты і падзеі, што не падпадалі пад пэўныя стэрэатыпы, часам фальсіфікаваліся. Пры гэтым паўтараліся старыя міфы і ствараліся новыя. Міф жа аб тым, што беларусы да Кастрычніцкай рэвалюцыі не мелі сваёй дзяржаўнасці, быў узведзены на канстытуцыйны ўзровень — аб гэтым было запісана ў прэамбуле Канстытуцыі БССР 1978 г., якая дзейнічала да 1994 г.[1]

Новыя прагрэсіўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці 90-х гадоў павялічылі цікавасць беларусаў да ўласнай гісторыі, а навукоўцаў арыентавалі на паслядоўнае, поўнае і ўсебаковае асвятленне гістарычных працэсаў. Нягледзячы на гэта, а таксама на больш значную даступнасць да архіўна-дакументальнага матэрыялу, у навуцы гісторыі дзяржавы і права Беларусі засталося шмат «белых плям» і спрэчных пытанняў. Гэта тычыцца і праблемы ўзнаўлення (менавіта патрэбна гаварыць аб узнаўленні, а не аб утварэнні) беларускай дзяржаўнасці ў першыя гады савецкай улады. Адносна беларускай савецкай дзяржаўнасці застаюцца праблемнымі як сам працэс утварэння, так і дата яе ўтварэння.

На пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі, якая ўвайшла ў склад Расіі ў канцы XVIII ст., актывізуецца нацыянальна-вызваленчы рух. Лютаўская рэвалюцыя, якая мела вынікам фактычнае троеўладдзе на Беларусі (органы расійскага Часовага ўраду, Саветы і ваеннае камандаванне Заходняга фронту), спрыялі дальнейшаму яго развіццю і кансалідацыі, нягледзячы на тое, што ўсе гэтыя ўлады амаль аднолькава варожа ставіліся да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Пазней Кастрычніцкая рэвалюцыя прывяла да стварэння бальшавікамі адзінага расійскага органа савецкай улады на тэрыторыі Беларусі — Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкомзаха). Кіраўнікі гэтага органа (А. Мяснікоў, В. Кнорын, К. Ландэр і

інш.) прытрымліваліся ідэі стварэння адзінай Расійскай савецкай дзяржавы і рашуча выступалі супраць самавызначэння Беларусі. В.Кнорын нават тэарэтычна абгрунтаваў неабходнасць таго, каб т.зв. Заходняя вобласць заставалася ў складзе РСФСР[2].

Нацыянальна-вызваленчы рух на Беларусі не меў кансалідацыі, аднак Вялікая Беларуская рада і Цэнтральная Беларуская вайсковая рада ў «Грамаце да беларускага народа» разам адкрыта сказалі аб негатыўных адносінах да дыктатуры пралетарыяту. У сваёй палітычнай праграме яны выказаліся за стварэнне на Беларусі дэмакратычнай рэспублікі, федэрацыю з Расіяй і іншымі суседнімі рэспублікамі і прапанавалі склікаць з’езд прадстаўнікоў усяго беларускага народа. Ідэю з’езда падтрымаў Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў, а ленінскі ўрад даў дазвол на яго правядзенне.

З 5 па 17 снежня ў Мінску адбыўся першы Усебеларускі з’езд, які пазней сталі называць таксама кангрэсам. 1872 дэлегаты былі выбраны саветамі рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, губернскімі і уезднымі зямельнымі камітэтамі, земствамі, нацыянальнымі і бежанскімі арганізацыямі і інш. З’езд быў вельмі прадстаўнічым і па партыйнаму складу: эсэры (правыя і левыя), сацыял-дэмакраты, анархісты, бальшавікі, кадэты, Беларуская партыя сацыялістаў-народнікаў, аб’яднаная дэмакратычная партыя «Адзінства», Беларуская дэмакратычная партыя, Беларуская сацыялістычная грамада і інш.[3]

Галоўнае пытанне, якое абмяркоўвалася на з’ездзе і вызвала спрэчкі – гэта форма самавызначэння Беларусі. Прадстаўнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, якія грунтаваліся вакол Вялікай Беларускай рады, выступалі за самавызначэнне Беларусі па ўзору еўрапейскіх буржуазна-дэмакратычных дзяржаў. Дэлегаты, якія падтрымлівалі Беларускі абласны камітэт, імкнуліся да аўтаноміі Беларусі ў складзе РСФСР. З’езд пайшоў на кампраміс і прыняў рашэнне стварыць часовы вышэйшы орган улады — Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які павінен быў замяніць створаныя пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі органы Савецай улады на Беларусі і Заходнім фронце. Як пішуць беларускія вучоныя-гісторыкі, з’езд не прызнаў легітымнасць бальшавіцкай улады і аб’явіў сябе вышэйшай уладай[4]. З гэтым трэба пагадзіцца, дадаўшы толькі, што з’езд не выказаў у сваіх пастановах адмоўных адносін да Савецкай улады, ён негатыўна ставіўся да Аблвыкомзаха, бо лічыў яго неправамоцным, ваенным і надзвычайным органам. Канчатковае ж

рашэнне пытання аб канстытуцыіраванні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці было вынесена на Устаноўчы сход, які павінен быў падрыхтаваць і склікаць Усебеларускі Савет. Аднак з'езд не паспеў абраць Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, а абраў толькі выканаўчы орган — Савет з'езда, бо пад матывам абароны савецкай улады СНК Аблвыкомзаха ў ноч з 17 на 18 снежня сваёй пастановай распусціў з'езд.

Гэта акцыя бальшавікоў Заходняй вобласці мела неадназначную ацэнку як у мінулым, так і ў сучасны перыяд, але большасць даследчыкаў лічыць, што з'езд быў «не распущен, а бесцеремонно разогнан»[5]. Відны дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху Е.Канчар ужо ў 1919 г. заявіў, што гэты факт «во всех отношениях явился преступлением и перед белорусским народом, и перед всемирной социалистической революцией»[6]. Між тым прэзідыум Усебеларускага з'езда не падпарадкаваўся рашэнню СНК Аблвыкомзаха і на падпольным паседжанні стварыў Выканкам рады з'езда, які паставіў мэтай барацьбу за ідэалы беларускай дзяржаўнасці.

Пасля разрыву перамоў паміж Расіяй і Германіяй у Брэсце нямецкае камандаванне 18 лютага 1918 г. аддае прыказ аб наступленні. 19 лютага Аблвыкомзах эвакуіруецца ў Смаленск. У гэты час Выканкам рады Усебеларускага з'езда бярэ ўладу ў свае рукі і 21 лютага выдае 1-ую Устаўную грамату, у якой абвяшчае сябе часовым органам улады на Беларусі да таго часу, пакуль будзе скліканы Устаноўчы сход (сойм). Устаноўчыя функцыі ўскладаюцца часова на створаны ім Народны сакратарыят.

3 сакавіка 1918 г. РСФСР падпісвае Брэсцкі мірны дагавор з Германіяй, у адпаведнасці з якім большая частка Беларусі застаецца за Германіяй. Аналізуючы гэтыя падзеі, І.А. Юхо піша: «Дакументы сведчаць, што менавіта бальшавіцкі ўрад, які падпісаў гэты дагавор, юрыдычна і фактычна разрываў сувязі з Беларуссю, пакідаў яе безабароннай. У такой сітуацыі абвяшчаць аўтаномію Беларусі ў складзе Расіі было немагчыма, ды і бессэнсоўна. Трэба было ратаваць народ ад нямецкай навалы, ствараць хаця б юрыдычную абарону»[7]. У сувязі з гэтай сітуацыяй Выканкам рады Усебеларускага з'езда выдае 9 сакавіка 2-ую Устаўную грамату, якой абвяшчае аб стварэнні Беларускай народнай рэспублікі. Ствараецца ўрад БНР – Рада, прэзідыум якой узначаліў прадстаўнік Беларускай сацыялістычнай грамады І.Серада. Да склікання Устаноўчага сойму Рада абвяшчаецца заканадаўчым органам, а прызначаемы і адказны перад ёю Народны сакратарыят — выканаўчым

органам. Устаўной граматай абвяшчаюцца дэмакратычныя свабоды грамадзян Беларусі: свабода слова, друку, сходаў, саюзаў, недатыкальнасць асобы і інш.

25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады БНР, на якой прысутнічалі прадстаўнікі віленскай Беларускай Рады, большасцю галасоў пасля доўгіх спрэчак (супраць галасавалі дэпутаты бундаўскай, земскай і гарадской фракцый, частка дэпутатаў устрымалася ад галасавання, частка ўвогуле пакінула паседжанне) была прынята 3-яя Устаўная грамата. У ёй гаварылася, што БНР «абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай... і павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічэбную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілёўшчыну, беларускія часці Меншчыны, Гродненшчыны (з Гроднам, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежных часцяў суседніх губерняў, заселеных беларусамі»[8]. У Грамаце гаварылася аб несправядлівасці падпісання Брэсцкага дагавору без удзелу Беларусі і ставілася мэта перад урадам БНР дабіцца яго перагляду.

Канстытуцыйная і юрыдычная абгрунтаванасць 3-яй Устаўнай граматы вынікае, як піша І.А.Юхо, з таго, што Рада БНР атрымала свае паўнамоцтвы ад Усебеларускага з’езда, дэлегаты якога прадстаўлялі большасць беларускага народа, а легітымнасць абвяшчэння незалежнасці БНР пацвярджаецца дэкрэтам СНК РСФСР ад 29 жніўня 1918 г., якім адмяняліся «все договоры и акты, заключенные правительством быв. Российской империи с правительством Королевства Прусского и Австро-Венгерской империи, касающиеся разделов Польши, ввиду их противоречия принципу самоопределения наций и революционному правосознанию русского народа»[9]. Тым самым дэкрэт скасоўваў акты, на падставе якіх беларускія землі былі далучаны да Расіі, што ў сваю чаргу давала права беларускаму народу ўзнавіць сваю дзяржаўнасць. Абвяшчэнне БНР не адпавядала інтарэсам суседніх дзяржаў і дзяржаў Антанты. Тэрытарыяльныя прэтэнзіі адносна Беларусі мела не толькі Германія, але і Польшча, якая імкнулася да ўзнаўлення польскай дзяржавы ў межах Рэчы Паспалітай 1772 г. Зацікаўлены былі ў пашырэнні сваіх тэрыторый усе суседнія дзяржавы. Менавіта таму ўтварэнне БНР вымусіла змяніць адносіны да беларускіх тэрыторый. Адразу ж пасля ўтварэння Рада БНР робіць захады для свайго прызнання іншымі дзяржавамі, спрабуе нават устанавіць кантакт з урадам РСФСР.

Восенню 1918 г. немцы пакідаюць тэрыторыю Беларусі і большасць кіраўнікоў БНР пераязджае ў Гродна. 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія займае

Мінск. У гэты час ЦК РКП (б) прымае рашэнне ўтварыць беларускую савецкую дзяржаўнасць. Адносна таго, чаму бальшавіцкі ўрад так рэзка змяніў адносіны да так званага «беларускага пытання», у гісторыка-прававой літаратуры выказваюцца розныя меркаванні. Вядома, бальшавікі-беларусы ўвесь час «будировали» гэта пытанне, аднак толькі ўтварэнне БНР і актыўная дзейнасць яе Рады актывізавалі гэты працэс. Афіцыйная ж прычына, аб якой гаварылася на Пленуме ЦК РКП (б), што быццам бы тым самым «закрывается коридор, через который устремляются на Советскую Россию силы Черного Интернационала»[10] — гэта проста прапагандысцкі выкрут. Не апошнюю ролю адыграла не зусім законнае пагадненне з немцамі і заняцце Чырвонай Арміяй тэрыторыі Беларусі. Аб гэтым сведчыць і тэрміновасць абвяшчэння БССР і непрадуманасць працэдуры ўтварэння.

25 снежня Сталін па тэлеграфу паведамляе аднаму з кіраўнікоў Аблвыкомзаха А.Мяснікову, што «ЦК партии решил по многим соображениям, о которых теперь говорить не приходится, согласиться с белорусскими товарищами на образование Белорусского советского правительства»[11]. Падпарадкоўваючыся партыйнай дысцыпліне, А.Мяснікоў і іншыя кіраўнікі Заходняй вобласці, якія раней выступалі супраць самавызначэння беларускага народа, займаюцца пытаннямі утварэння БССР. У ЦК РКП (б) і Наркамнацы РСФСР абмяркоўваецца склад Часовага ўраду, у які ўключаецца некалькі бальшавікоў-беларусаў.

30 снежня 1918 г. у Смаленску склікаецца VI Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя РКП (б), якая абвяшчае сябе І з’ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Разам з абмеркаваннем партыйных пытанняў (у тым ліку фарміраваннем кіруючага партыйнага органа — Цэнтральнага бюро КПБ(б) на чале з А.Мясніковым), з’езд вырашае пытанні дзяржаўна-прававога характару і прымае рэзалюцыю аб абвяшчэнні Беларускай ССР і пастанову аб граніцах рэспублікі. Тэрыторыю БССР складаюць Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродненская губерні, а таксама часткі Ковенскай, Віленскай, Сувалкскай, Чарнігаўскай губерняў, населеных пераважна беларусамі. Тым самым бальшавіцкі ўрад вымушаны быў лічыцца з абвешчанай Устаўнымі граматамі тэрыторыяй БНР. У пастанове гаварылася таксама, што тэрыторыя БССР падраздзяляецца на 7 раёнаў і 54 падраёны. Аднак практычныя мерапрыемствы адносна новага адміністрацыйна-

тэрытарыяльнага падзелу не былі праведзены, бо ў лютым 1919 г. рэспубліка ўвогуле перастала існаваць.

1 студзеня 1919 г. у Смаленску быў абнародаваны першы канстытуцыйны акт новай дзяржавы — Маніфест Часовага Рабоча-Сялянскага ўраду Беларусі. У ім абвяшчалася ўтварэнне Беларускай савецкай рэспублікі, гаварылася аб прыналежнасці ўлады толькі Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, аб адмене пастаноў акупацыйных уладаў і Рады БНР (Рада ўвогуле аб'яўлялася па-за законам), аб увядзенні 8-гадзіннага рабочага дня і інш. Адзначалася таксама, что ўрад Беларускай Савецкай Незалежнай Рэспублікі (такая назва асабліва вылучана ў тэксце Маніфеста, хаця прысутнічаюць і іншыя назвы — Сацыялістычная Савецкая Працоўная Рэспубліка Беларусі і г.д.), «пастаўлен на пасты рашэннем I з'езда КПБ і воляй саветаў Беларусі»[12]. Аднак трэба адзначыць, што на з'ездзе КПБ не абмяркоўвалася пытанне аб урадзе (матэрыялы з'езда не гавораць аб гэтым), бо склад ураду быў вызначаны загадзя расійскім кіраўніцтвам.

У сувязі з гэтым узнікае пытанне не толькі аб легітымнасці Часовага Рабоча-Сялянскага ўраду, але і аб даце ўтварэння БССР. У мінулыя дзесяцігоддзі святкаванні юбілейных датаў утварэння БССР, як правіла, праводзіліся ў канцы снежня, прычым аднвчасова адзначалася дата ўтварэння БССР і КПБ (б), хаця сама дата не называлася. Аднак нельга лічыць датай утварэння Беларускай ССР тую дату, калі адбылася Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП (б), якая абвясціла сябе I-ым з'ездам КПБ (б), бо Кампартыя з'яўлялася адной з некалькіх грамадскіх арганізацый (існавалі і іншыя партыі) і ўладных паўнамоцтваў яна не мела. Адносна 1 студзеня 1919 г. можна сказаць, што нягледзячы на няпэўную працэдуру ўтварэння Часовага Рабоча-Сялянскага ўраду, дзень абвяшчэння яго Маніфесту можна з нацяжкай лічыць датай утварэння БССР, бо легітымнасць яе была пацверджана пазней I з'ездам Саветаў БССР і прынятай ім першай беларускай савецкай Канстытуцыяй (3 лютага 1919 г.), а таксама наступнымі заканадаўчымі актамі рэспублікі. Так, у Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ (так стала называцца рэспубліка па Канстытуцыі 1919 г.), якая была прынята пасля ліквідацыі кароткі час існаваўшай Літоўска-Беларускай ССР, гаварылася, што асноўныя палажэнні аб арганізацыі народнагаспадарчага жыцця, абвешчаныя 1 студзеня 1919 г. у Маніфесце Часовага Рабоча-Сялянскага ўраду Беларусі, узнаўляюцца ў поўнай меры[13].

Пасля паўторнага абвяшчэння Беларускай ССР тэрыторыю яе склалі толькі шэсць уездаў Мінскай губерні, а заходнія землі Беларусі адпаведна Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 г., заключанаму паміж Польшчай і Расіяй без удзелу БССР, адышлі да Польскай дзяржавы.

Такім чынам, працэс ўзнаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці быў вельмі складаным і драматычным.

---

[1] Конституция (Основной закон) Белорусской Советской Социалистической Республики. Минск, 1978. С. 4.

[2] Кнорин В.Г. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте. Минск, 1925.

[3] Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской Республики. Октябрь 1917 – декабрь 1918 г. Минск, 1975. С. 128.

[4] История Беларуси: Учебн. пособие // А.Е.Абцедарская, П.И.Бригадин, Л.А.Жилунович и др. Минск, 1997. С. 198.

[5] Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч. II. Учебн. пособие под ред. Энтина Э.М. Гомель, 1993. С. 97; Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мінск, 1996. С. 83.

[6] Канчар Е. Белорусский вопрос. Пг., 1919. С. 125.

[7] Юхо Я. Беларускія ўрады 1918-1921 гг. і іх паўнамоцтвы // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 4. С. 65.

[8] Довнар Т.И. Краткий очерк истории государства и права Республики Беларусь (послеоктябрьский период). Минск, 1997. С. 64.

[9] Юхо Я. Там жа. С. 66.

[10] Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. С. 131.

[11] Борьба за советскую власть в Белоруссии. Сборник документов и материалов. Т.I. Минск, 1968. С. 414-415.

[12] Довнар Т.И. Короткий очерк истории государства и права Республики Беларусь. С.68-71.

[13] Там жа. С. 87.